Г.П.Бушчык
кандыдат гістарычных навук,
дацэнт

## Знешнеэканамічная дзейнасць у гаспадарчым развіцці Беларусі: гістарычны аспект

Тэрыторыя Беларусі знаходзіцца на водарazделе Балтыйскага і Чорнага мора, у геаграфічным цэнтры Еўропы, і гэта запраграмавала яе пасрэдніцкае становішча паміж Поўднем і Поўначчу, Усходам і Захадам. Транзітнае становішча тэрыторыі Беларусі стала яе галоўным эканамічным рэсурсам, крыніцай даходаў яшчэ ў далекай старажытнасці, з часоў утварэння раннефеадальных дзяржаў.

Па гандлеваму шляху «з вараг у грэкі» рухаліся значныя матэрыяльныя каштоўнасці, якія адначасова багацілі і нашу зямлю. Грашовыя скарбы 9 -11 стагоддзя, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі, найбольш красамоўна акрэсліваюць схему гандлевых шляхоў у старажытнасці: вялікія «грошы» ішлі праз Полацкае і Тураўскае княствы, яны асядалі тут не толькі ў выглядзе скарбаў, але найперш як мытныя падаткі, як «працоўныя месцы» на складах і волаках, як пабудова і арэнда купецкіх факторый і г.д.. Разам з тым менавіта полацкія, віцебскія, смаленскія, а таксама кіеўскія і чарнігаўскія купцы былі галоўнымі пастаўшчыкамі візантыйскіх тавараў у Паўночную і Заходнюю Еўропу.

Вялікае княства Літоўскае, якое ўзнікла ў 13 ст. у выніку кансалідацыі славянскіх і балцкіх протанародаў у час вялікіх нашэсцяў (з Захаду - крыжакоў, з Усходу - манголаў), у другой палове 14 ст. працягнулася ад Балтыйскага да Чорнага мора. Дзяржава нашых продкаў кантралявала важнейшыя гандлевыя патокі ва ўсе бакі свету, найперш еўрапескія гандлевыя шляхі. Самаэконамічная кан'юнктура 15-16 ст.ст. спрыяла найбольш інтэнсіўнаму і прыбытковаму развіццю гандлю. Гандлевыя шляхі багацілі краіну, рабілі яе прывабнай для жыхарства. Гарадское насельніцтва даволі хутка павялічвалася, а найбольш заможнай яго катэгорыяй было менавіта купецтва.

Нашы продкі надзвычай умела выкарыстоўвалі транзітныя магчымасці сваей дзяржавы. Не толькі дзяржаўныя органы збіралі мыту, але прывілеі ад Вялікага князя на «падарожныя», «маставыя», «кірмашовыя» і г.д. мелі мясцовыя феадалы. Адначасова яны павінны былі трымаць у добрым стане дарогі,

масты, судаходныя рэчышчы; рамантаваць іх па меры неабходнасці. На дзяржаўных землях «Устава на валокі» 1557 г. прадпісвала адміністрацыі раўняць вуліцы (нават пераносіць пабудовы і дамы, калі тыя перашкаджалі выраўнованню), масціць іх камянямі і пасыпаць пяском, каб не ламаліся колы павозак. Калі дарогі былі ў дрэнным стане і наносілі шкоду купецкім вазам, уладальнікі зямель неслі прамую матэрыяльную адказнасць - плацілі штрафы (гл. арт. 29-31 Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 г).

Усе перавагі, звязаныя з транзітным гандлем, выкарыстоўвалі ў тыя часы не нашы мацнейшыя або слабейшыя суседзі, купцы з далекіх краеў, а менавіта «аседлыя» літвіны. Звычайна замежныя купцы павінны былі гандляваць у Вялікім княстве оптам. Прывілей на дробны гандаль іншаземнымі таварамі (акрамя спецыяльна вызначаных міжнародных кірмашоў) мелі мясцовыя купцы. Яны скупалі тавар на мяжы па мінімальных цэнах і прадавалі яго ў розніцу на тэрыторыі дзяржавы, альбо везлі праз другую мяжу і прадавалі ў суседніх ці далекіх краінах. Такім чынам літвінскія гандляры атрымлівалі значныя прыбыткі.

Дзяржава праводзіла пратэкцыяніскую палітыку ў адносінах да ўласных вытворцаў: прывазную прадукцыю забаранялася прадаваць у гарадах і мястэчках, калі аналагічная выраблялася мясцовымі рамеснымі цэхамі. Замежным купцам забаранялася скупаць прадукцыю ў насельніцтва: гэтым прывілеем таксама карысталіся менавіта мясцовыя гандляры.

Калі ў 15-16 ст.ст. у Еўропе адбываецца рэвалюцыя цэн, як вынік геаграфічных адкрыццяў і прытоку каштоўных металаў у Еўропу, шляхта актыўна ўключаецца ў таварную вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, цэны на якую ўзраслі на еўрапейскім рынку прыкладна ў два разы. Усталеўваецца фальварачная сістэма арганізацыі панскай гаспадаркі, арыентаваная на вытворчасць таварнай прадукцыі. Шляхта атрымлівае права бязмытнага правозу праз дзяржаву і вывазу за мяжу прадукцыі, выраблена ва ўласным маентку.

Такім чынам, беларускія землі ў складзе Вялікага княства Літоускага, Рускага, Жамойцкага і іншых зямель яшчэ ў большай меры, чым раней, выкарыстоўвалі для свайго эканамічнага ўзбагачэння транзітнае становішча ў еўрапейскім і еўрапейска-азіяцкім гандлі. «Рэвалюцыя цэн», рост гарадоў і рэзкае павелічэнне патрэбы на еўрапейскім рынку ў сельскагаспадарчай

еўрапейскім гандлі як пастаўшчыкоў уласнай прадукцыі: збожжа, воску, лену, паташу, пянькі, хмелю, сала, футру і г.д. Невыпадкова дзяржава нашых продкаў нагадвала «Амерыку» Сярэдњявечча. Многія людзі з іншых краін імкнуліся пасяліцца ў Вялікім княстве, атрымаць шырокія магчымасці для эканамічнай дзейнасці (гэта, безумоуна, датычыла шляхты і гараджан і не датычыла сялян). Але атрымаць грамадзянства («аседласць») і разам з ім многія эканамічныя прывілеі (свабода перамяшчэння, недатыкальнасць маемасці, частковае або поўнае вызваленне ад мытаў) было даволі складана. Патрабавалася даказаць пражыванне сваіх бацькоў, уласнае нараджэнне і пражыванне ў Вялікім княстве, добрую рэпутацыю, засведчыць карысную дзейнасць для дзяржавы.

Кіруючыся гэтым, Вялікі князь Вітаўт запрашаў нават вялікія групы цэлых народаў на жыхарства ў дзяржаву. Напрыклад, страціўшага трон у Ардзе татарскага хана Тахтамыша з войскам ен пасяліў на паўночна-заходніх землях Беларусі, дзе татарскія воіны абараняли межы краіны ад крыжакоў. Татары таксама займаліся конегадоўляй, узвозам, развівалі тагачасны транспарт. Прывілеі на жыхарства, фінансавую і гандлевую дзейнасць былі дадзены Вітаўтам яўрэйскім абшчынам-кагалам. Яўрэйскія гандляры, ліхвяры-банкіры, рамеснікі ўносілі свой уклад у ажыўленне эканомікі і гандлю. Караімы, якія прыехалі з Крымскага ханства, былі сусветна вядомымі гарбарамі і спрыялі ўдасканаленню гэтага рамяства ў Вялікім княстве. Нямецкія рамеснікі і гандляры распаўсюджвалі перадавыя па тым часе тэхналогіі, ад іх беларускія рамеснікі пераняли і перадавую ў 15 - 16 ст. ст. арганізацыю рамеснай вытворчасці - цэхі. У немцаў гарады Беларусі пераймалі і прынцыпы арганізацыі гарадскога самакіравання - Магдэбургскае права.

Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае было шматнацыянальнай дзяржаваю, але прадстаўнікі розных народаў і канфесій жылі тут даволі мірна, не праследаваліся за веру (у адрозненне ад астатняй Еўропы). У 16 ст. заканадаўча была замацавана роўнасць усіх канфесій у праве займаць дзяржаўныя пасады. Верацярпімасць значна спрыяла эканамічнай і гандлевай дзейнасці.

Люблінская ўнія з Польшчаю не стала значнай перашкодай у актыўнай знешнеэканамічнай дзейнасці беларускіх зямель. У складзе Рэчы Паспалітай Вялікае княства Літоўскае мела значную

аўтаномію, сваю мытную тэрыторыю, праўда, ужо страціла тэрыторыю Украіны, якая адміністрацыйна адышла да Польшчы.

Войны сярэдзіны 17-пачатку 18 ст. і звязаныя з імі эканамічныя і дэмаграфічныя катастрофы, перажытыя нашымі продкамі, разбурэнне большасці гарадоў і іх эканамічны заняпад сведчылі аб наступленні «новай эры» у нашай гісторыі. Геаграфічнае становішча нашай тэрыторыі ператварылася з пераваг і крыніцы багацця ў крыніцу праблем і стратаў. Узмацніўшыся, суседнія народы, ды й наогул сусветныя цэнтры хрысціянства сталі высвятляць на нашай зямлі свае адносіны. Новая ваенная тэхніка і новыя прынцыпы вядзення войнаў (раней - перамагчы воінаў-феадалаў і захапіць зямлю, людзей, маемасць, а зараз - знішчыць, асабліва пры адступленні, чалавечыя і маемасныя рэсурсы праціўніка) так «прапрасавалі» беларускія землі з Усходу на Захад, з Поўначы на Поўдзень і наадварот, што эканамічныя рэсурсы былі вынішчаны на стагоддзі (толькі ў сярэдзіне 17 ст. напалову скарацілася насельніцтва Беларусі, плошчы ворыўных зямель, яшчэ ў большай ступені пацярпела гарадская гаспадарка).

Ператварыўшыся з цэнтра ў акраіну дзяржаў (у эканамічным, і як вынік, у палітычным сэнсе), спачатку Рэчы Паспалітай, потым Расійскай імперыі, беларускія землі становятся бясплатным гандлевым калідорам, які стаў надзвычай карысным гэтым дзяржавам. Галоўны эканамічны рэсурс - геаграфічнае становішча на скрыжаванні гандлевых шляхоў - які багаціў нашы землі стагоддзямі, на стагоддзі быў страчаны. Гандлевыя шляхі паранейшаму праходзілі праз нашы землі, яны ўзбагаціліся ў 19-м ст. чыгункамі, у 20-м ст. - паветранымі шляхамі, трубаправодамі, але даходамі з іх насельніцтва Беларусі распараджалася, ды напэўна, і распараджаецца зараз, у апошнюю чаргу. Прадстаўляецца відавочным і справядлівым у новай палітычнай сітуацыі выкарыстаць транзітнае становішча Рэспублікі Беларусь у сучаснай Еўропе ў поўнай меры.

Калі ў старажытнасці знешнеэканамічная дзейнасць ажыццяўлялася галоўным чынам у форме знешняга і транзітнага гандлю, то ў новым і найноўшым часе яна дапаўняецца вытворчай кааперацыяй, стварэннем сумесных прадпрыемстваў, фінансава-інвестыцыйнай дзейнасцю і г.д. Так, яшчэ ў часы Вялікага княства Літоўскага, вызначаецца вытворчая спецыялізацыя беларускіх зямель як сельскагаспадарчага і ляснога рэгіёну. У складзе Расійскай імперыі лес, лен, жыта, авес, пянька, воўна, іншая сельскагаспадарчая прадукцыя пастаўляліся як на ўнутраны

расійскі рынак, так і ў Англію, Германію, Швецыю, іншыя краіны. Асабліва трэба адзначыць спецыялізацыю беларускіх губерняў у 19 ст. на вытворчасці масла, сыру, мяса, алкагольнай прадукцыі. У канцы 19 ст. на Беларусі было больш за 400 вінакурань, якія давалі 60-70 % даходаў памешчыцкіх маенткаў. Вытворчасць спірту на душу насельніцтва тут была самая высокая ў Расійскай імперыі, а спажыванне - самае нізкае. Спірт і гарэлка вывозіліся не толькі ў іншыя рэгіёны Расіі, але і ў іншыя краіны, напрыклад, Германію. У наш час алкаголь - адзін з самых прыбытковых тавараў. Можна сцвярджаць, што наша дзяржава яшчэ не мае такога ўзроўню прыбытковасці ад гэтай вытворчасці, якую мела ў 19 ст. наша шляхта. Малочная і мясная прадукцыя з Беларусі таксама яшчэ ў 19 ст. стала займаць галоўнае месца ў харчаванні расійскіх сталіц - Масквы і Пецярбурга. Традыцыйна на Беларусі складвалася буйное памешчыцкае землеўладанне, што спрыяла развіццю шматгаліновай, высокапрадукцыйнай гаспадаркі, а па аснашчанасці машынамі сельская гаспадарка беларускіх губерняў лідзіравала ў Расіі разам з прыбалтыйскімі губернямі.

У 20-м ст., асабліва пасля другой сусветнай вайны, эканоміка Беларусі набывае новыя якасныя параметры, становіцца найбольш высокатэхналагічнай у СССР. Амаль поўнае знішчэнне даваеннай прамысловай базы як бы падрыхтавала свабодную пляцоўку, якая забудоўвалася трафейнымі заводамі, навукаемістымі, высокатэхналагічнымі па сваім часе, у тым ліку ваеннымі прадпрыемствамі. Эканоміка Беларусі набывае выгляд «зборачнага цэха» Саюза. Па розных адзнаках і параметрах 70 - 90 % беларускай вытворчасці было «завязана» на Саюз. Там, найперш у Расіі, знаходзіліся крыніцы сыравіны, вытворчасць камплектуючых, а таксама пункты збыту большасці аб'емаў беларускай прадукцыі (трактароў, аўтамабіляў, мінеральных угнаенняў, штучных валокнаў, халадзільнікаў і г.д.).

Не заўсёды саюзная кааперацыя была апраўданай: металаемістая і энергаемістая прадукцыя выраблялася ў рэспубліцы, дзе адчуваўся значны дэфіцыт гэтых рэсурсаў; «вялікая хімія» Беларусі, значная частка якой таксама ў большасці завозілася, забруджвала і забруджвае нашу атмасферу. Разам з тым відавочна, што патэнцыял Саюза дазволіў ператварыцца сельскагаспадарчай Беларусі ў адзін з найбольш высокатэхналагічных рэгіёнаў са значнай часткай ваеннай вытворчасці, якая была канкурэнтаздольнай у свеце. Разам з тым

фарміраваўся і ўзмацняўся экспартны характар нашай эканомікі, яе надзвычайная адкрытасць і арыентаванасць на экспарт-імпарт. Распад Саюза зусім не азначае абавязковага разрыву эканамічна карысных і ўзаемавыгадных сувязяў. Для Рэспублікі Беларусь вельмі важна не страціць сваю высокатэхналагічную прамысловую базу (гэта не азначае, што некаторыя вытворчасці могуць стаць эканамічна нявыгаднымі і пасля грунтоўнага аналізу, магчыма, іх трэба перапрафіляваць ці скасаваць), ператварыцца, па магчымасці, у еўрапейскага «тыгра», магчыма, і з дапамогаю дзяржкапіталізма, каб не «раздавілі» транснацыянальныя карпарацыі.

Ва ўмовах новых гістарычных рэаліяў для нашай краіны вельмі важна вызначыць свае сапраўдныя эканамічныя інтарэсы і пастарацца не пераблытаць іх з інтарэсамі нашых партнераў па сусветнай гаспадарцы. Відавочна, што для эканамічна развітых краін Беларусь і Расія найперш цікавяць як рынак збыту (у тым ліку заляжалай прадукцыі). Яны не зацікаўлены ў існаванні тут вытворчых канкурэнтаў. Мацнеючы расійскі капітал беларуская зямля цікавіць найперш як бясплатны калідор у Еўропу, каб з Расіі везці сыравіну, а ў Расію - заходнія хадавыя тавары. Гэтыя памкненні нашых партнераў па сусветнай гаспадарцы не ў поўнай меры адпавядаюць нашым нацыянальным інтарэсам, якія найперш у тым, каб на Ўсходзе захаваць рынкі збыту нашай прадукцыі, а за транзіт сыравіны атрымаць адпаведную плату. На Захадзе трэба старацца, наколькі гэта магчыма, набываць не тавары, а навейшыя тэхналогіі, зацікавіць партнераў стварэннем сумесных прадпрыемстваў, высокай кваліфікацыяй і працавітасцю нашых работнікаў, магчымасцю выкарыстання рынку краін СНД.

Новая сусветная кан'юктура, калі эканамічнае лідэрства краін вызначаюць не запасы сыравіны, а высокі ўзровень тэхналогій, развіцця навукі, кваліфікацыі кадраў, транспартнай інфраструктуры прадстаўляе Беларусі шанц заняць неблагое месца ў сусветнай гаспадарцы, у поўнай меры выкарыстаць уласны і сусветны гістарычны вопыт, рэалізаваць магчымасці, адстаяць свае эканамічныя інтарэсы.